2. *Выготский Л.С.* К вопросу о динамике детского характера // Выготский Л.С. Собр. соч.: в 6 т. – М.: Педагогика, 1984. – Т. 5. – С. 98.

3. *Чеснокова И.И.* Особенности развития самосознания в онтогенезе // Принцип развития в психологии. – М.: Наука, 1978. – С. 317–318.

**В.І.Баравік,** *ст.выкладчык*

## ВЫХАВАЎЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ПРАЦЭСУ ФАРМІРАВАННЯ ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ СТУДЭНТАЎ

Сёння сацыякультурная, эканамічная і палітычная сітуацыя ў краіне фарміруе ў грамадзян рэальныя патрабаванні да ведання замежных моў. Камунікатыўныя і тэхналагічныя пераўтварэнні ў грамадстве ўцягнулі як у непасрэдныя, так і ў апасродкаваныя зносіны вялікую колькасць людзей самых розных прафесій, узросту і інтарэсаў. Адпаведна ўзрасла і патрэбнасць у валоданні замежнымі мовамі.

Усё гэта вымушае змяніць адносіны да ўзроўню валодання замежнымі мовамі і азначыць новыя падыходы да адбору зместу матэрыялу для вывучэння.

Моўная культура з'яўляецца неад'емнай часткай культуры асобы ўвогуле.

У нашы дні сацыякультурны кантэкст вывучэння замежных моў значна змяніўся. Узраслі іх адукацыйная, самаадукацыйная і выхаваўчая функцыі, іх прафесійная значнасць у вышэйшай навучальнай установе, на рынку працы, што выклікала ўзмацненне матывацыі ў вывучэнні моў [1].

Спецыфікай замежнай мовы як навучальнай дысцыпліны з'яўляецца яе ярка выяўлены міжпрадметны характар, асабліва

калі ставяцца задачы вывучэння моў і культур на ўсіх узроўнях і пры ўсіх варыянтах навучання.

Вывучэнне замежнай мовы садзейнічае ўсведамленню агульначалавечых каштоўнасцей. Прадметам вывучэння становяцца матэрыяльна-тэхнічныя, маральна-этычныя і культурна-гістарычныя каштоўнасці як краіны вывучаемай мовы, так і роднай. Фарміруюцца ўяўленні аб актуальных праблемах сацыяльна-палітычнага жыцця, аналізуюцца маральна-этычныя традыцыі ў грамадстве, пытанні сучаснай маралі, набываецца інфармацыя аб помніках гісторыі і творах мастацтваў агульначалавечай значнасці. Выхоўваецца актыўнае і зацікаўленае стаўленне да духоўнага жыцця іншых краін, павага да нацыянальных традыцый.

Усведамленне агульначалавечых каштоўнасцей нельга аддзяліць ад пачуцця нацыянальнай самабытнасці. Студэнты, якія разам з мовай вывучаюць жыццё іншых краін, з большай павагай ставяцца да традыцый і звычаяў свайго народа. На занятках па замежнай мове ёсць умовы для міжмоўнага параўнання, выяўлення экспрэсіўных магчымасцей роднай і замежнай моў, выхавання павагі да роднай мовы. Таму магчыма сцвярджаць, што пры эфектыўнай арганізацыі заняткаў вывучэнне замежных моў садзейнічае выхаванню патрыятызму і культуры міжнародных зносін. Гэта выхаванне ажыццяўляецца перш за ўсё праз змест вучэбнага матэрыялу і ўжыванне розных метадаў і прыёмаў.

Вялікае значэнне маюць змест гутарковай дзейнасці, у першую чаргу тэматыка і змест вусных выказванняў; тэкстаў для чытання, аўдыё- і відэазапісаў. Па меры засваення замежная мова робіцца сродкам атрымання інфармацыі па розных галінах навукі і культуры. Выкладчык павінен удзяляць увагу адбору вучэбнага матэрыялу, таму што ў ім перш за ўсё і змешчаны вялікія магчымасці маральнага выхавання [2].

Сучасная методыка навучання замежным мовам вызначыла ў якасці прыярытэтнай асобасна-дзейнасную арыентава-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насць зместу і працэсу навучання. Гэтая арыентаванасць мае на ўвазе пошук і стварэнне аптымальных умоў для лінгвістычнай кагнітыўнай дзейнасці асобы. Вынікам такой дзейнасці з'яўляецца лінгвакультуралагічная кампетэнцыя. Тэрмін "кампетэнцыя" разглядаецца як сукупнасць ведаў, навыкаў, уменняў, што фарміруюцца ў працэсе вывучэння замежнай мовы.

Мова і культура з'яўляюцца раўнапраўнымі, узаемаабумоўленымі аб'ектамі вывучэння. Таму падзел лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі на ўласна лінгвістычную і культуралагічную ўяўляецца не зусім натуральным, хаця тлумачэнне выкладчыкам граматычных тэм, паслядоўнае выкананне практыкаванняў фарміруюць у асноўным лінгвістычную частку кампетэнцыі навучэнцаў, а знаёмства з культурнымі набыткамі краіны вывучаемай мовы – яе культуралагічную частку.

Спынімся на лінгвакультурных з'явах, якія садзейнічаюць рознабаковаму развіццю і выхаванню навучэнца.

Адным са шматфункцыянальных феноменаў мовы з'яўляецца тэкст. Як з'ява моўнай і экстралінгвістычнай рэчаіснасці тэкст разглядаецца ў якасці сродку камунікацыі і спосабу захавання і перадачы інфармацыі, адлюстравання псіхалагічнага жыцця індывіда, а таксама асаблівасцей нацыянальнай культуры і традыцый.

Гэтае разуменне функцыянальнасці і зместавай напоўненасці тэксту дае магчымасць адзначыць, што ў тэксце ў той ці іншай ступені знаходзяць адлюстраванне ўсе значныя часткі лінгвакультурнай сучаснасці краіны вывучаемай мовы.

У адпаведнасці з праграмнымі патрабаваннямі навучанне замежным мовам у нямоўных вышэйшых навучальных установах ажыццяўляецца ў асноўным на матэрыяле тэкстаў вузкапрофільнага характару. Такім чынам, фарміруецца і прафесійная накіраванасць студэнтаў. У мэтах эстэтычнага выхавання выкарыстоўваюцца артыкулы, тэксты аб жыцці і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчасці знакамітых дзеячаў беларускай і замежнай культуры і мастацтва.

Пры знаёмстве з тэкстам навучэнец набывае веды ў галіне іншай культуры. Тэкст у шырокім яго разуменні разглядаецца як палігон для набыцця такіх ведаў. Аднак сацыякультурныя стэрэатыпы гутарковых зносін рэалізуюцца не толькі ў тэксце. Матэрыяльнай часткай камунікацыі з'яўляецца рэчаіснасць.

Аб'ектыўнай рэчаіснасцю ў метадычным полі навучання замежным мовам з'яўляецца моўнае асяроддзе як натуральны гістарычна канкрэтны лінгвакультурны соцыум.

Прыёмы педагагічнай арганізацыі дазваляюць вылучыць два тыпы навучання: навучанне ў моўным і пазамоўным асяроддзі. Зразумела, што дамінуе апошні тып навучання. Аднак, паколькі перад выкладчыкам паўстае задача развіцця лінгвакультурнай кампетэнцыі навучэнцаў, прысутнасць у тым ці іншым выглядзе кампанентаў аб'ектыўных атрыбутаў моўнага асяроддзя неабходна. Гэта – арыгінальныя публіцыстычныя і мастацкія фільмы, матэрыялы Internet і інш.

Дакладна зробленыя акцэнты пры дэманстрацыі практычнага функцыянавання лінгвакультурных з'яў у камунікатыўным полі садзейнічаюць рознабаковаму развіццю і выхаванню асобы навучэнца, фарміраванню яго культуралагічнай кампетэнцыі [3].

---

1. *Бердичевский А.Л.* Содержание обучения иностранному языку на основе базовой культуры личности // Иностранные языки в школе. – 2004. – №2. – С.17–20.

2. *Чеушева С.А.* Сочетание когнитивно-эмоционального и поведенческого компонентов воспитания патриотизма и культуры межнациональных отношений у студентов в процессе изучения иностранного языка // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. – 2003. – №1. – С.1–12.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Орехова И.А.* Формирование лингвокультурологической компетенции в процессе обучения иностранным языкам // Иностранные языки в школе. – 2004. – №5. – С.28–30.

**Н.А.Белоусов,** *профессор*

## ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ СТУДЕНТОВ ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ВУЗА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В социальном и профессиональном становлении студенческой молодежи важную роль играет патриотическое воспитание. В процессе патриотического воспитания у студентов развиваются социально значимые мотивы укрепления экономического и оборонного потенциала страны, в их сознании формируются героический идеал, ответственное отношение к военной службе. Патриотизм – действенное средство сохранения и приумножения трудовых и боевых традиций белорусского народа.

В современной научно-педагогической литературе и практике патриотизм принято понимать как качество личности, содержанием которого являются любовь к Отечеству, гордость за прошлое и настоящее, готовность защищать интересы своей Родины. Подлинный патриотизм – не фраза о любви к Родине, а активная жизненная позиция студента.

По своей природе патриотизм – явление социальное и педагогическое, в нем ярко выражены определенные социально-нравственные отношения: к Родине, где студент родился, социально формировался и реализует себя как личность; к своему народу, делами и традициями которого гордится и их приумножает; к самому себе как члену общества.

В духовном становлении личности студента огромную роль играет цель патриотического воспитания, которая определяет его общественную направленность. На формирование социаль-